2. *Вырщиков, А. Н.* Патриотическое воспитание молодежи в современном российской обществе. – Волгоград, 2006.

3. *Лутовинов, В. И.* Патриотическое воспитание молодежи – концепция и реальность // Будущие хозяева России. – М. : «Реалисты». – 1996. – № 24. – С. 54–58.

# РЭІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ГАЛОЎНАГА СІМВАЛА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

***Н. А. Комлік-Ямаціна,***
*магістр культуралогіі, аспірант;*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

З даўніх часоў чалавецтва выкарыстоўвае графічныя сімвалы: кола, крыж, зорка, мандала і інш. І, хаця сімволіка даследуецца яшчэ з Антычнасці, а ў XIX ст. з'явілася нават цэлая галіна навукі – семіялогія (працы Ч. С. Пірса, С. Лангер, Ф. дэ Сасюра, Э. Касірэра, Ю. Лотмана і інш.), ёсць яшчэ шмат лакун у ведах пра гэты феномен чалавечай культуры.

У першую чаргу непаўната ведаў пра сімвал звязана са шматфункцыянальнасцю апошняга: разнастайныя сімвалы выкарыстоўваюцца як нацыянальны ідэнтыфікатар, у рытуалах і абрадах, для сакралізацыі ці ўпрыгожвання рэчаў паўсядзённага ўжытку і інш. Але асноўныя функцыі графічнай сімволікі звязаны з фіксацыяй (у некаторых выпадках – шыфраваннем) ведаў. Ад першабытнай магіі і да сучасных камп'ютарных кодаў сімвал ёсць пэўны аб'ём інфармацыі.

Графічная сімволіка па сённяшні дзень з'яўляецца важным элементам культуры, і не толькі ў галіне мастацтва. «У сацыяльна-палітычнай сферы сімволіка адыгрывае немалаважную ролю. Дзяржаўныя герб і сцяг, нацыянальны касцюм, сувенірная прадукцыя і нават некаторыя элементы рэкламы, абапіраючыся на традыцыйную сімволіку, на падсвядомым узроўні кансалідуюць грамадства» [4, с. 290]. На нашу думку, менавіта кансалідуючая функцыя нацыянальнай сімволікі і з'яўляецца галоўным падмуркам для выбару галоўных сімвалаў дзяржавы, не апошняе месца з якіх займае сімволіка арміі – апоры пануючай улады як на міжнародным, так і ўнутрыдзяржаўным узроўні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На прыкладзе галоўнага сімвала Працоўна-сялянскай Чырвонай арміі – пяціканцовай зоркі – паспрабуем даследаваць асноўныя механізмы ўвядзення такой сімволікі «ў народ» на пэўным гістарычным этапе і яе рэінтэрпрэтацыю наступнымі пакаленнямі.

На сённяшні дзень існуе не адна класіфікацыя графічных сімвалаў: класіфікацыя знакаў Ч. С. Пірса, класіфікацыя арнаментаў па семантычным крытэрыі і інш. Па арэале выкарыстання можна вылучыць наступныя класы графічных сімвалаў:

– агульнасусветныя (вядомыя са старажытнасці ў розных частках свету: кола, крыж, свастыка, зорка і інш.);

– монакультурныя (характэрныя для адной культуры, для аднаго этнасу: унікальныя арнаменты Палесся, Сібіры, скандынаўскія руны і г. д.);

– вузкаспецыялізаваныя (выкарыстоўваюцца ў пэўнай галіне ці асобнай групай людзей: распяцце ў хрысціянстве, камп’ютарныя ці шыфравальныя коды і да т. п.) сімвалы.

Варта адзначыць, што і монакультурныя, і вузкаспецыялізаваныя сімвалы ў большасці выпадкаў абапіраюцца на агульнасусветныя, дадаючы пэўныя дэталі і рэінтэрпрэтуючы іх у адпаведнасці са сваімі мэтамі. Звычайна гэта адбываецца двума шляхамі: поўнае і частковае запазычанне. Згодна з першым варыянтам, сімвал выкарыстоўваецца цалкам, з мінімумам выпраўленняў формы, у семантыцы дапушчальна спрашчэнне сэнсу і тлумачэнне праз каштоўнасці і паняцці супольнасці, якая яго выкарыстоўвае. Пры другім варыянце пакідаецца толькі аснова сімвала, якая аздабляецца дадатковымі дэталямі і напаўняецца новым, часам вельмі слаба звязаным з папярэднім, сэнсам, адпаведным ідэалогіі «карыстальніка».

На працягу гісторыі такія запазычанні можна назіраць неаднаразова. Аднымі з самых вядомых на постсавецкай прасторы з’яўляюцца выкарыстанне левабаковай свастыкі Нацыянал-сацыялістычнай працоўнай партыяй Германіі (пазней – як асноўнага сімвала Трэцяга рэйха) і ўкараненне пяціканцовай зоркі ў якасці галоўнага сімвала Працоўна-сялянскай Чырвонай арміі. З-за гэтых запазычанняў і падзей, звязаных з выкарыстаннем у сярэдзіне XX ст., стаўленне да пяціканцовай зоркі і свастыкі ў сучаснай Еўропе неадназначнае.

Разгледзім больш падрабязна галоўны сімвал Чырвонай Арміі. У «Савецкай ваеннай энцыклапедыі» даводзіцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«В июле 1918 г. пятиконечная красная звезда с эмблемой “плуг и молот” по решению 5-го Всерос. Съезда Советов была установлена как отличит. значок для ношения на головных уборах красноармейцев и командиров РККА» [5, с. 424]. З гэтага часу і пачынаецца масавае ўкараненне чырвонай пяціканцовай зоркі ў сімволіку Чырвонай Арміі. Чырвоная пяціканцовая зорка павінна была сімвалізаваць барацьбу рэвалюцыянераў за волю і шчасце. Аўтар даследавання гісторыі з’яўлення зоркі ў Чырвонай Арміі А. Сцяпанаў прыводзіць у сваім артыкуле тэкст загаду Узброеным Сілам Расійскай рэспублікі ад 8 верасня 1918 г. № 2: «Общим отличием всякого служащего Рабоче-Крестьянской Красной Армии установлена Красная эмалевая пятиконечная звезда. […] Эта революционная красная звезда должна резко выделяться на одежде каждого революционера-красноармейца, как символ той великой и святой идеи, к достижению которой стремится каждый истинный революционер, – идеи освобождения бедного люда от ига поработителей и эксплуататоров, идеи любви и служения своему ближнему и борьбы за его права» [6]. У тым жа артыкуле аўтар прыводзіць архіўныя фотаздымкі з выявамі першых «савецкіх» зорак:




*Мал. 1.* Варыянты какард з пяціканцовымі зоркамі
(калекцыя А. Сцяпанава)

Акрамя тлумачэнняў у спецыяльных загадах у артыкуле прыводзіцца ўлётка Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Камітэта Саветаў сялянскіх, працоўных, салдацкіх і казачых дэпутатаў «Почему Красная армия носит красную звезду?». У ёй прыводзіцца казка пра «красную девицу Правду» і «черную Кривду». У ілбе Праўды ззяла чырвоная зорка, у святле якой людзі жылі шчасліва. Крыўда скрала гэтую зорку, і наступіў хаос. І толькі «добрый молодец» (чырвонаармеец) змог вызваліць зорку Праўды, каб яна зноў асвятляла шлях добрым людзям. З тых часоў і стала чырвоная зорка сімвалам «добрых молодцев» – чырвонаармейцаў, якія кладуць жыццё на барацьбу са злом дзеля шчасця ўсіх людзей.

Такія «казкі» і «афіцыйныя» тлумачэнні сімвалізму пяціканцовай зоркі поўнасцю адпавядаюць механізму «стварэння традыцыі» Эрыка Хобсбаума [7, с. 48–50]. Але пасля распаду Савецкага Саюза і паслаблення савецкай ідэалогіі вытокі пяціканцовай зоркі сталі шукаць у традыцыі масонскай ложы (А. Грэйг [4] і інш). Сапраўды, калі параўнаць чырвоную зорку Чырвонай Арміі і адзін з галоўных сімвалаў масонства – пентаграму, можна знайсці не так ужо і шмат адрозненняў. Асноўнае – замена кабалістычнай літары «G» у цэнтры на выявы молата і плуга, якія, па задумцы савецкага кіраўніцтва, сімвалізавалі працоўных і сялян. Па некаторых звестках, на першапачатковым варыянце прапаноўвалася выява кнігі як сімвала інтэлігенцыі, але «…Коллегия остановилась на пятиконечной звезде, но с изображением на ней только молота и плуга, и в таком виде этот отличительный знак получил одобрение тов. Троцкого» [6]. Гэта можна назваць гістарычным кур’ёзам, бо ў масонскай традыцыі пентаграма сімвалізуе ў першую чаргу веды, з дапамогай якіх можна зразумець Сусвет.

Але пяціканцовая зорка – сімвал, які з’явіўся задоўга да стварэння масонскай ложы. Яго можна сустрэць у найстаражытнейшых магічных трактатах, дзе адзначаецца, што пяціканцовая зорка «играет большую роль в магических традициях и расценивается как благодетельная, если указывает остриём вверх, и как знак чёрной магии, если острие находится в обратном положении» [2, с. 91]. І гэта таксама паступова пачынае ўлічвацца пры даследаваннях сімволікі Савецкага Саюза (у прыватнасці – Чырвонай Арміі). Аднак семантычнае напластаванне савецкай ідэалогіі яшчэ трывала трымаецца ў свядомасці старэйшага пакалення, і чырвоная пентаграма ўспрымаецца як рэвалюцыйны сімвал. Таксама, як свастыка ў многіх асацыюецца з фашызмам. Але новыя пакаленні даслед-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыкаў патроху пачынаюць «здымаць» напластаванні XX стагоддзя са старажытных сімвалаў і вяртаць ім першапачаткова сэнс.

Такім чынам, на прыкладзе бытавання пяціканцовай зоркі як сімвала Чырвонай Арміі савецкіх часоў, можна прыйсці да высновы, што асноўныя сімвалы любой ідэалогіі маюць карані ў агульнасусветнай традыцыі. І, хаця пры іх укараненні ствараюцца новыя «традыцыі» і фарміруюцца новыя семантычныя ядры, з цягам часу сімвалам вяртаюць іх першапачаткова сэнс, прапушчаны праз навукова-культурную парадыгму сучаснасці.

1. *Бауэр, В.* Энциклопедия символов / В. Бауэр, И. Дюмотц, С. Головин ; пер. с нем. Г. Гаева. – М. : КРОН-ПРЕСС, 1998. – 512 с.

2. *Бидерман, Г.* Энциклопедия символов / Г. Бидерман ; пер. с нем. В. М. Валькова. – М. : Республика, 1996. – 334 с.

3. *Грейг, О.* От НКВД до Аненэрбе: магия печатей Звезды и Свастики / О. Грейг. – М. : Эксмо: Алгоритм, 2010. – 304 с.

4. *Комлік-Ямаціна, Н. А.* Сімволіка грашовых знакаў Беларусі / Н. А. Комлік-Ямаціна // Современные интеграционные процессы и Республика Беларусь: европейский и евразийский контекст: материалы 6-й Междунар. науч.-практич. конф. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: В. Н. Ватыль [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2014. – С. 290–293.

5. Советская военная энциклопедия в 8 томах ; ред. совет В. Е. Ворошилов, А. А. Бубнов [и др.]. – М. : «Сов. энциклопедия», 1977. – Т. 4 : К–Л. – 654 с.

6. *Степанов, А.* Мифы и действительность / А. Степанов // «Старый ЦЕЙХГАУЗ», Российский военно-исторический журнал, М., № 2/2010 (34) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://historymania.info/view_post.php?id=139. – Дата доступа: 21.02.2015.

7. *Hobsbaum, E.* The Invention of Tradition, Cambridge, 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ

***Д. А. Крывашэй,***
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Паспрабуем акрэсліць некаторыя пытанні сучаснай дзяржаўнай культурнай палітыкі, вырашаць якія неабходна зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў і пагроз, вызначаных Канцэпцыяй